Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Ільянскі яслі- сад”

# Гульня–віктарына
# “Беларусам я завуся, родным краем ганаруся!”

Мэта:

І тур: "ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ"

1. Назавіце колеры дзяржаўнага сцяга РБ. *(чырвоны, зялёны, белы)*
2. Назавіце колькасць і назвы абласцей нашай краіны. *(6 абласцей, Брэсцкая, Гомельская, Гродзенская, Мінская, Магілёўская, Віцебская)*
3. З якімі краінамі мяжуе РБ? *(Расія, Літва, Латвія, Польшча, Украіна)*
4. Як называецца закон, які вызначае жыццё нашай краіны, правы і абавязкі грамадзян? *(Канстытуцыя РБ)*
5. Колькі жыхароў пражывае на тэрыторыі нашай краіны? *(каля 10 мільёнаў)*

ІІ тур: "СКАРБОНКА МУДРАСЦІ" (прадоўжы прыказку)

1. Пры сонейку цёпла, пры …. *(мамачцы добра)*
2. Няма лепшае хаткі, чым …. *(у роднай маткі)*
3. Дарагая тая хатка, дзе …. *( нарадзіла мяне матка)*
4. "Свая гульня". Няма смачнейшай вадзіцы, як … *(з роднай крыніцы)*
5. Родная зямля мякчэйшая, чым … *(чужая пярына)*
6. Ад працы рукі не сохнуць.
7. Ад ляноты чакай бядоты.
8. Без навукі, як без рук.
9. Бяда хоць мучыць, але жыць вучыць.
10. Дарагая тая хатка, дзе нарадзіла мяне матка.
11. Дзе коратка, там і рвецца, дзе балюча, там б'ецца.
12. За дурной галавой нагам неспакой.
13. З вялікага грому малы дождж.
14. Каб конь добра вёз, давай яму авёс.

15. Мокры дажджу не баіцца.

16. Няма лепшай хаткі, як у роднай маткі.

17. Родная зямелька, як зморанаму пасцелька.

18. У сваім краі, як у раі.

19. У родным лесе і куст родны.

III тур: “ЛЕТАПІС МУДРАСЦІ”

1. Які горад у краіне носіць ганаровае імя горада-героя? *( Мінск)*
2. “Свая гульня”. Назавіце горад, які ў гады Вав прыняў на сябе першы ўдар фашысцкіх захопнікаў. ( Брэст)
3. Назавіце вёску, спаленую фашыстамі у гады Вав, на месцы якой зараз знаходзіцца мемарыяльны комплекс. *(Хатынь*)
4. Калі тэрыторыя нашай краіны была цалкам вызвалена ад фашыстаў? *(3 ліпеня 1944г.*)
5. Колькі жыхароў Беларусі загінула ў гады ВАВ? *(больш за 4 мільёны)*

IV тур: “МЫ ТВАЕ СЯБРЫ. ПРЫРОДА”

1. Які караняплод лічыцца сімвалам Беларусі? *(бульба)*
2. Назавіце самага магутнага звера – жыхара беларускіх лясоў. *(Зубр*)
3. Як завецца самая вялікая птушка, што гняздуецца на тэрыторыі Беларусі? (Лебедз-шыпун, яго вага 12 кг.) –
5. У які годзе была выдадзена Чырвоная кніга РБ? (1981г.)
6. Якія дрэвы растуць у хвойным лесе? (Сасна, елка)
7. Яіх жывёл называюць будаўнікамі? (Бабёр)
8. Назавіце драпежных жывёл нашых лясоў. (Воўк, дзік, ліса)
9. Якія жывёлы Беларусі на зіму змяняюць свой колер? (Заяц, ліса, вавёрка)
10. Назавіце ядавіты грыб, якім лечыцца лось. (Мухамор)
11. Якія птушкі астаюцца ў нас зімаваць? (Верабей, сарока, варона)

12. Хто ўдзень адпачывае, а ноччу лятае? (Сава)

13. Якая птушка выводзіць птушанят зімой? (Крыжадзюб)

14. Якія звяры і птушкі занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь? (Зубр, мядзведзь, барсук, бусел, вялікая белая чапля)

15. Назавіце лекавыя расліны нашых лугоў. (Рамонак, зверабой, тысячаліснік і інш.)

16. Назавіце драпежную рачную рыбу. (Шчупак)

17. Назавіце самага злоснага шкодніка бульбы.

V тур: ГАРАДЫ.
Ад кожнай каманды запрашаю па два ўдзельнікі да дошкі. Ім трэба назваць назву горада, які пачынаецца з вызначанай літары. Хто хутчэй і правільна зробіць, той і будзе пераможцам.

| | |
|---|---|
| О — Орша | Е — Ельск |
| Р — Рагачоў | Л — Лепель |
| А — Асіповічы | А — Ашмяны |
| Д — Добруш | Р — Рэчыца |
| У — Ушачы | С — Слонім |
| І — Івацэвічы | |

VI тур: ГУЛЬНЯ “АДГАДАЙ ЗАГАДКІ”.
Урадзіўся ён высокі,
Шаўкавісты, сінявокі.
Апранае нас здавён,
Здагадайцеся, хто ён? (Лён)

Цвіту ўсё лета я.
Жыву звычайна ў жыце.
Нашу хлапечае імя.
Як зваць мяне, скажыце? (Васілёк)

Сядзіць бабуся, сядзіць хатуся,
А хто забачыць, дык заплпчыць. (Цыбуля)

Не кравец, а ўсё жыццё
з іголкамі ходзіць? (Вожык)

Малайцы! Вы добра выканалі ўсе заданні. Вось і падыйшла да завяршэння наша віктарына.